Источник: "Краязнаўчая газета" - 2018-02-28

# Жыццё ў дзесяці тамах

***Пералік званняў, рэгаліяў, пасадаў, літаратуразнаўчых працаў і літаратурных твораў народнага пісьменніка Беларусі Івана Навуменкі зойме не адну старонку друкаванага тэксту. Спіс усіх, хто працаваў, меў стасункі ці знаёмства з Іванам Якаўлевічам, таксама незлічоны. Таму ў інфармацыйна-выставачнай зале Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дзе 15 лютага адбылася прэзентацыя збору твораў І. Навуменкі і кнігі ўспамінаў пра яго, не было вольных месцаў. Імпрэза доўжылася больш за тры гадзіны, але нават не ўсе ахвочыя змаглі выказацца. Мерапрыемства было прымеркаванае да 93-га дня нараджэння пісьменніка.***

Распавесці аб працы над выданнямі і падзяліцца ўспамінамі пра сустрэчы з І. Навуменкам прыйшлі навукоўцы Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, якія працавалі над выданнем 10-томнага збору твораў, стваральнікі кнігі «Летуценнасць і вялікія здзяйсненні: успаміны пра Івана Якаўлевіча Навуменку», кіраўнікі выдавецкага дома «Беларуская навука» і выдавецтва «Мастацкая літаратура».



*Аляксандр Лакотка, Аляксандр Груша, Іван Саверчанка*

Прэзентацыя двух згаданых выданняў – апошняе з плана мерапрыемстваў па ўвекавечванні памяці І. Навуменкі, прынятага 15 жніўня 2008 г. пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1171. Цяпер план цалкам ажыццёўлены: імя пісьменніка нададзенае Васілевіцкай гарадской бібліятэцы і вуліцы ў Мінску, Белпошта выпусціла памятную марку і канверт.

Выданне збору твораў пісьменніка было самай складанай і працаёмкай справай. 1-ы том выйшаў у 2012 г., апошнія 8-ы, 9-ы і 10-ы тамы – у 2017 г. Тады ж «Беларуская навука» выпусціла кнігу ўспамінаў пра І. Навуменку, выданне дапоўненае спісамі мастацкіх і навуковых публікацыяў І. Навуменкі, спісам публікацыяў пра яго творчасць і дзейнасць.

Шмат намаганняў прыклалі даследчыкі, каб прасачыць, як удасканальваў пісьменнік свае творы. Над кожным з іх І. Навуменка працаваў бадай што ўсё жыццё. Каб вызначыць канчатковы варыянт твора для друку, укладальнікі збору дэталёва вывучалі і параўноўвалі рукапісы, машынапісы, першае і наступныя выданні. Шмат дапамаглі ў гэтым рэдактары выдавецтва «Мастацкая літаратура».



*Валерыя Навуменка*



*Алесь Лапата-Загорскі*

Алесь Лапата-Загорскі, укладальнік 2-га і 6-га тамоў, паведаміў пра знойдзеныя ў архівах творы пісьменніка, якія раней не друкаваліся. Удакладніць апісанні дарог, якімі хадзілі героі твораў Навуменкі, дапамагла паездка ў Карэлію.

Апошні, 10-ы, том быў самым складаным. У яго ўвайшлі адзіная напісаная цалкам п'еса, інтэрв'ю, анкеты, водгукі на дысертацыі, успаміны і дзённікавыя запісы, лісты, вершы. Гэтыя матэрыялы былі знойдзеныя ў сямейных архівах сваякоў пісьменніка, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа, Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры і ў Рэчыцкай раённай бібліятэцы.

Уражаннямі ад сустрэчаў з І. Навуменкам падзяліліся Раіса Баравікова, Аляксандр Лакотка, Анатоль Вярцінскі, Ігар Валатоўскі, Іван Ліштван. Выступілі таксама дачка пісьменніка Валерыя Іванаўна, Іван Саверчанка, Аляксандр Лукашанец ды іншыя.

Пад час сустрэчы была разгорнутая вялікая кніжная выстаўка «Праўдзівасць і мастацтва слова Івана Навуменкі – даследчыка і пісьменніка», дзе прадстаўленыя першыя публікацыі, сучасныя перавыданні, літаратурнакрытычныя артыкулы і кнігі, раманы, апавяданні, аповесці, пераклады твораў, літаратура аб жыцці і дзейнасці творцы.

*Наталі КУПРЭВІЧ*
*Фота аўтара*

Наталля Купрэвіч. Жыцце ў дзесяці тамах